Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны
ўніверсітэт імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
В.а. рэктара, першы прарэктар БДПУ
__________ С.І.Копцева
«_29_» _08_ 2019 г.

Рэгістрацыйны № ВД-34-1-43-2019/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбная прагарама ўстановы вышэйшай адукацыі
факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі
для слухачоў падрыхтоўчых курсаў

2019 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове праграмы ўступных іспытаў па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова» для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі І ступені або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, зацверджанай загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.10.2018 №765

СКЛАДАЛЬНІК:
А.А.Квяткоўскі, ст. выкладчык

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай методыкі выкладання інтэграваных школьных курсаў
пратакол № 1 ад 27.08.2019

Загадчык кафедры А.У.Цытрон

Саветам факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі
пратакол № 1 ад 28.08.2019

Старшыня Савета факультэта С.У.Якавенка

Афармленне вучэбнай праграмы і матэрыялаў, якія яе суправаджаюць, адпавядае дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Метадыст ВМУ Г.В.Вінаградава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Беларуская мова” на факультэце даўніверсітэцкай падрыхтоўкі разлічаны на паглыбленне, сістэматызацыю і абагульненне ведаў слухачоў па фанетыцы, лексіцы, словаўтварэнні, граматыцы, стылістыцы, тэксце, арфаграфіі і пунктуацыі.

Вучэбная праграма складзена на падставе “Праграмы ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі” на 2019 год, зацверджанай загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 30.10. 2018 г. за № 765.

**Мэта** вучэбнай дысцыпліны - забяспечыць засваенне ведаў па беларускай мове на базавым і паглыбленым узроўнях для далейшай паспяховай здачы ўступных іспытаў у выглядзе цэнтралізаванага тэсціравання; садзейнічаць развіццю сродкамі мовы камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай і мастацка-эстэтычнай культуры абітурыентаў; развіццю імкнення да бесперапыннай самаадукацыі, да пастаяннага абнаўлення ўласных ведаў; удасканаліць спосабы пазнаваўчай дзейнасці слухачоў у працэсе самастойнага вывучэння дадатковай вучэбнай і энцыклапедычнай літаратуры.

Для дасягнення пастаўленай мэты прадугледжваецца рэалізаваць наступныя **задачы:**

-сістэматызаваць і замацаваць веды, развіць аналітыка-сінтэтычныя ўменні слухачоў па раздзелах “Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія”, “Лексіка і фразеалогія”, “Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія”, “Сінтаксіс і пунктуацыя”, “Маўленне”;

-скарэктаваць найбольш тыповыя для слухачоў адхіленні ад лексіка-граматычных і вымаўленчых нормаў беларускай літаратурнай мовы;

-удасканальваць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць слухачоў;

-замацаваць і пашырыць веды слухачоў пра тэкст, удасканальваць навыкі аналізу і стварэння тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў;

-забяспечыць практычнае выкарыстанне лінгвістычных ведаў і ўменняў ва ўласнай маўленчай дзейнасці;

-ствараць умовы для развіцця пазнавальнай актыўнасці, творчых здольнасцей слухачоў;

-садзейнічаць пры вывучэнні курса фарміраванню ў слухачоў універсальных уменняў і навыкаў вучэбнай дзейнасці (уменні і навыкі работы з вучэбнай і справачнай літаратурай, самастойнага пошуку адказаў на пастаўленыя пытанні і асмыслення атрыманай інфармацыі і г.д.);

-садзейнічаць фарміраванню ўмення працаваць з тэставымі заданнямі рознага ўзроўню і рознай формай адказу (закрытай і адкрытай);

-забяспечыць пастаянны кантроль за засваеннем вучэбнага матэрыялу на занятках і падчас самастойнай работы слухачоў;

-стварыць умовы для далучэння ўсіх слухачоў у інфармацыйна-адукацыйнае ўзаемадзеянне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-стварыць умовы для павышэння культуры зносін і, такім чынам, садзейнічаць развіццю камунікатыўных навыкаў.

**Асноўнай формай арганізацыі работы** падчас выкладання курса з'яўляюцца практычныя заняткі, наведванне якіх – абавязковая ўмова выканання вучэбнага плана. Дзеля больш глыбокага вывучэння пэўнай тэмы і фарміравання шэрагу практычных уменняў і навыкаў пазнавальнай дзейнасці (самастойна працаваць з літаратурай, слоўнікамі і энцыклапедыямі, творча аналізаваць прачытанае, сістэматызаваць яго і г.д) праграмай прадугледжваецца самастойная работа слухачоў курсаў. З аднаго боку такі від работы з'яўляецца асобнай формай навучання, якая ажыццяўляецца без непасрэднага ўмяшальніцтва выкладчыка, з другога – сродкам прыцягнення слухачоў у самастойную пазнавальную дзейнасць, сродкам фарміравання ў іх спосабаў і навыкаў яе арганізацыі і ажыццяўлення. Асноўнай формай кантролю эфектыўнасці самастойнай працы з'уляецца выкананне тэставых заданняў. Для правядзення заняткаў прадугледжана поўнае арганізацыйна-метадычнае забеспячэнне.

**Да асноўных метадаў навучання і выхавання** падчас выкладання вучэбнай дысцыпліны можна аднесці наступныя. У залежнасці ад крыніцы атрымання ведаў: славесныя (гутарка, праца з друкаванымі і электронннымі крыніцамі і г.д.), наглядныя (выкарыстанне табліц), практычныя (самастойная падрыхтоўка/вывучэнне шэрагу тэм, прадугледжаных праграмай) метады. У залежнасці ад характару пазнавальнай дзейнасці слухачоў па засваенні вучэбнага матэрыялу трэба адзначыць тлумачальна-ілюстратыўны, рэпрадуктыўны, часткова-пошукавы, праблемны метады.

**Асноўнымі формамі прамежкавага і выніковага кантролю ведаў** слухачоў падчас вывучэння курса з'яўляюцца вусныя адказы, залікі па асобных раздзелах праграмы ў выглядзе кантрольных работ, выніковы залік пасля заканчэння навучання. Усе пісьмовыя работы праводзяцца ў форме тэсціравання.

У выніку вывучэння курса "Беларуская мова" **слухачы павінны ведаць**:

-прыметы тэксту; спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце; тыпы маўлення і іх тыповыя кампазіцыйныя схемы; стылі маўлення;

-гукі, літары і іх суадноснасць;

-правілы напісання галосных і зычных, іх спалучэнняў; напісанне слоў разам, праз злучок і асобна; напісанне малой і вялікай літары, мяккага знака і апострафа;

-адназначныя і мнагазначныя словы; прамое і пераноснае значэнні слоў; сінонімы, амонімы, антонімы; фразеалагізмы, іх значэнне;

-марфемную будову слова; спосабы ўтварэння слоў;

-часціны мовы, іх значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічную ролю;

-віды сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні;

-простыя і складаныя сказы; спосабы перадачы чужога маўлення;

-пунктуацыйныя правілы.

**А таксама ўмець:**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-вызначаць прыметы тэксту, фармуляваць яго асноўную думку; вызначаць спосаб і сродкі сувязі сказаў у тэксце; вызначаць прыналежнасць тэксту да пэўнага тыпу, стылю і жанру;

-адрозніваць гукі і літары, устанаўліваць паміж імі адпаведнасць; рабіць фанетычны разбор слоў;

-правільна вымаўляць гукі і іх спалучэнні ў маўленчай плыні; ставіць націск у словах;

-пісаць словы ў адпаведнасці з арфаграфічнымі правіламі;

-вызначаць лексічнае значэнне слоў; размяжоўваць прамое і пераноснае значэнні слоў; падбіраць да слоў сінонімы, антонімы, амонімы;

-выяўляць у сказах фразеалагізмы, разумець іх значэнні, вызначаць іх сінтаксічную ролю;

-выдзяляць у словах марфемы; размяжоўваць вытворныя і невытворныя словы; адрозніваць спосабы ўтварэння слоў;

-распазнаваць часціны мовы і іх формы ў сказах, тэкстах на аснове іх сэнсавых, граматычных і сінтаксічных прымет; рабіць марфалагічны разбор часцін мовы;

-вызначаць віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях;

-распазнаваць сказы рознай будовы;

-рабіць сінтаксічны разбор словазлучэння, сказа;

-правільна ставіць знакі прыпынку ў простых сказах, сказах ускладненай будовы, складаных сказах; выпраўляць пунктуацыйныя памылкі;

-правільна афармляць дыялог і сінтаксічныя канструкцыі з простай мовай.

**На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская мова” на падрыхтоўчых курсах** вучэбным планам адведзена наступная колькасць гадзін. Курсы працягласцю 8 месяцаў разлічаны на **160 аўдыторных гадзін,** чатырохмесячныя курсы – **на 60 аўдыторных гадзін**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| НАЗВА РАЗДЗЕЛА | НАЗВА ТЭМЫ | КОЛЬКАСЦЬ АЎДЫТОРНЫХ ГАДЗІН | |
|---|---|---|---|
| | | Падрыхтоўчыя курсы (160 гадз.) | Падрыхтоўчыя курсы (60 гадз.) |
| **Раздзел I. Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія** | **Частка 1.1. Фанетыка** | | |
| | Гукі беларускай мовы | **2** | **1** |
| | Арфаэпічныя нормы | **2** | **1** |
| | Прызначэнне і гукавое значэнне літар | **1** | **1** |
| | Склад і націск | **1** | **0** |
| | Роля націску пры адрозненні слоў і некаторых формаў слоў | **2** | **0** |
| | Акцэнталагічныя нормы беларускай мовы. | **2** | **0** |
| | **Усяго:** | **10** | **3** |
| | **Частка 1.2. Арфаграфія** | | |
| | Прынцыпы беларускай арфаграфіі | **1** | **0** |
| | Арфаграфічныя нормы беларускай мовы | **2** | **0** |
| | Правапіс галосных *о, э, а*; *е, ё, я.* | **2** | **1** |
| | Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах | **2** | **1** |
| | Прыстаўныя галосныя, іх правапіс | **2** | **1** |
| | Зычныя літары, іх вымаўленне і правапіс | **1** | **0** |
| | Прыстаўныя і ўстаўныя зычныя, іх правапіс. | **1** | **0** |
| | Падоўжаныя зычныя, іх правапіс | **2** | **1** |
| | Правапіс *у–ў* | **2** | **1** |
| | Правапіс мяккага знака і апострафа. | **2** | **1** |
| | Ужыванне вялікай літары. | **1** | **0** |
| | Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна | **2** | **1** |
| | **Усяго:** | **19** | **8** |
| **Раздзел II. Лексіка і фразеалогія** | **Частка 2.1. Лексіка** | | |
| | Слова, яго лексічнае значэнне | **2** | **1** |
| | Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова | **2** | **0** |
| | Амонімы | **2** | **0** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Сінонімы, антонімы | **2** | **1** |
| | Паронімы | **1** | **1** |
| | **Усяго:** | **9** | **3** |
| | **ЧАСТКА 2.2. Фразеалогія** | | |
| | Фразеалагізмы | **1** | **0** |
| | Лексічныя і фразеалагічныя нормы беларускай мовы | **2** | **1** |
| | **Усяго:** | **3** | **1** |
| **РАЗДЗЕЛ III. Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія** | **ЧАСТКА 3.1. Марфемная будова слова** | | |
| | Марфемы як структурна значымыя часткі слова. Аснова слова. | **2** | **1** |
| | Канчатак, нулявы канчатак. | **1** | **0** |
| | Корань. Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго ж слова. | **2** | **1** |
| | Чаргаванне галосных і зычных у аснове слова. | **2** | **0** |
| | Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны. Правапіс *й, і, ы* пасля прыставак. | **2** | **1** |
| | **Усяго:** | **9** | **3** |
| | **ЧАСТКА 3.2. Словаўтварэнне і арфаграфія** | | |
| | Словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы. | **2** | **1** |
| | Асноўныя спосабы ўтварэння слоў | **3** | **1** |
| | Складаныя словы, іх утварэнне і правапіс. | **1** | **0** |
| | Складанаскарочаныя словы,іх утварэнне і правапіс | **1** | **0** |
| | Словаўтваральныя і арфаграфічныя нормы беларускай мовы. | **2** | **1** |
| | **Усяго:** | **9** | **3** |
| **РАЗДЗЕЛ IV. Сінтаксіс і пунктуацыя** | **ЧАСТКА 4.1. Сінтаксіс** | | |
| | Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні. Класіфікацыя словазлучэнняў па галоўным слове | **2** | **1** |
| | Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове | **1** | **0** |
| | Сказ як асноўная сінтаксічная адзінка | **1** | **0** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Тыпы сказаў па структуры, мэце выказвання і інтанацыі. Знакі прыпынку ў канцы сказаў | **3** | **1** |
| | Просты сказ. Парадак слоў у сказе. Развітыя і неразвітыя сказы | **1** | **0** |
| | Двухсастаўныя сказы. | **5** | **1** |
| | Даданыя члены сказа. Спосабы выражэння даданых членаў сказа | **5** | **2** |
| | Аднасастаўныя сказы | **1** | **1** |
| | **Усяго:** | **19** | **6** |
| | **ЧАСТКА 4.2. Пунктуацыя** | | |
| | Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе | **1** | **0** |
| | Сказы з аднароднымі членамі. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа | **6** | **1** |
| | Сказы са звароткамі. Спосабы выражэння зваротка. Знакі прыпынку пры зваротку | **2** | **1** |
| | Сказы з пабочнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі | **2** | **1** |
| | Сказы з устаўнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з устаўнымі канструкцыямі | **2** | **1** |
| | Сказы з адасобленымі членамі. Сказы з адасобленымі азначэннямі і прыдаткамі. Знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях і прыдатках | **6** | **1** |
| | Сказы з адасобленымі дапаўненнямі. Знакі прыпынку пры адасобленых дапаўненнях | **2** | **1** |
| | Сказы з адасобленымі акалічнасцямі. Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях | **2** | **1** |
| | Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі. | **2** | **0** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі | | |
| | Сказы з параўнальнымі зваротамі. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі | **2** | **2** |
| | Складаны сказ. Сінтаксічныя прыметы складанага сказа. Сродкі сувязі частак складанага сказа. Тыпы складаных сказаў | **4** | **3** |
| | Складаназлучаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах | **4** | **2** |
| | Бяззлучнікавыя складаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах | **5** | **2** |
| | Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак | **5** | **2** |
| | Простая і ўскосная мова як спосабы перадачы чужой мовы. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Правілы замены простай мовы на ўскосную | **5** | **1** |
| | Дыялог. Знакі прыпынку пры дыялогу | **1** | **1** |
| | Цытаты. Правілы афармлення цытат на пісьме | **1** | **0** |
| | Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы | **1** | **1** |
| | **Усяго:** | **54** | **19** |
| **Раздзел V. Маўленне** | Маўленне. Тэкст. Стылістыка | **1** | **2** |
| | Паняцці «мова» і «маўленне». Віды маўленчай дзейнасці. | **1** | **2** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Культура вуснага і пісьмовага маўлення | **1** | **2** |
| | Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту. Загаловак. Спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце | **3** | **1** |
| | Тыпы маўлення іх кампазіцыйныя схемы | **3** | **1** |
| | Функцыянальныя стылі маўлення, стылеўтваральныя моўныя сродкі | **5** | **3** |
| | **Усяго:** | **20** | **11** |
| | Паўтарэнне вывучанага | **8** | **3** |
| | **Усяго:** | **160** | **60** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Раздзел I. Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія**

Гукі. Літара як знак гука. Прызначэнне літар ***е, ё, ю, я, і.***

Знаёмства з тыпамі маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне (прызначэнне і будова).

Галосныя гукі. Вымаўленне і правапіс галосных ***о, э, а, е ,ё, я***. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў ***іё, (ыё ), ія (ыя), іе (ые)*** у запазычаных словах.

Зычныя гукі. Зычныя цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя; глухія, звонкія, санорныя; свісцячыя і шыпячыя. Іх вымаўленне і правапіс.

Цвёрдыя і мяккія зычныя, іх вымаўленне і правапіс. Зацвярдзелыя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

Мяккі знак і апостраф. Зычныя ***[д]-[дз'], [т]-[ц'],*** іх вымаўленне і правапіс. Правапіс ***у, ў.***

Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс. Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс. Гутарковы стыль, яго выкарыстанне, моўныя асаблівасці, жанры.

Роля націску пры адрозненні слоў і некаторых формаў слоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Раздзел II. Лексіка і фразеалогія**

Словы як назвы рэчаў, з'яў, паняццяў. Слова, яго лексічнае значэнне.

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слова.

Амонімы, іх адрозненне ад мнагазначных слоў. Сінонімы, антонімы, іх роля ў маўленні. Паронімы.

Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні. Лексічныя і фразеалагічныя нормы беларускай мовы.

Агульнаўжывальныя словы. Прафесійныя словы і тэрміны. Састарэлыя словы.

**Раздзел III. Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія**

Змяненне і ўтварэнне слоў. Марфемная будова слова. Аснова і канчатак. Нулявы канчатак. Корань слова (паўтарэнне). Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго ж слова. Прыстаўка і суфікс як значымыя часткі слова. Чаргаванне зычных і галосных у аснове. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны. Правапіс *й, і, ы* пасля прыставак.

Асноўныя спосабы ўтварэння слоў: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны, бяссуфіксны, постфіксальны; складанне слоў і асноў.

Складаныя словы, іх утварэнне і правапіс.

Складанаскарочаныя словы, іх утварэнне і правапіс.

Словаўтваральныя і арфаграфічныя нормы беларускай мовы.

**Раздзел IV. Сінтаксіс і пунктуацыя**

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні. Віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні. Класіфікацыя словазлучэнняў па галоўным слове.

Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

Сказ як асноўная сінтаксічная адзінка.

Тыпы сказаў па структуры, мэце выказвання і інтанацыі. Знакі прыпынку ў канцы сказаў.

Просты сказ. Парадак слоў у сказе. Развітыя і неразвітыя сказы.

Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік, спосабы іх выражэння. Просты дзеяслоўны выказнік. Састаўны дзеяслоўны і састаўны іменны выказнікі. Сувязь выказніка і дзейніка, выражанага колькасна-іменным спалучэннем. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

Даданыя члены сказа: азначэнне, дапаўненне, акалічнасць. Спосабы выражэння даданых членаў сказа. Прыдатак як разнавіднасць азначэння.

Аднасастаўныя сказы, іх будова.

Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе.

Сказы з аднароднымі членамі. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку пры аднародных членах сказа з абагульняльнымі словамі.

Сказы са звароткамі. Спосабы выражэння звароткa. Неразвітыя і развітыя звароткі. Знакі прыпынку пры звароткy.

Сказы з пабочнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі.

Сказы з устаўнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з устаўнымі канструкцыямі.

Сказы з адасобленымі членамі.

Сказы з адасобленымі азначэннямі (дапасаванымі, недапасаванымі) і прыдаткамі. Знакі прыпынку пры адасобленых азначэннях і прыдатках.

Сказы з адасобленымі дапаўненнямі. Знакі прыпынку пры адасобленых дапаўненнях.

Сказы з адасобленымі акалічнасцямі. Знакі прыпынку пры адасобленых акалічнасцях.

Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі.

Сказы з параўнальнымі зваротамі. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі.

Складаны сказ. Сінтаксічныя прыметы складанага сказа. Сродкі сувязі частак складанага сказа. Тыпы складаных сказаў.

Складаназлучаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Складаназалежныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы як сродкі сувязі частак складаназалежнага сказа. Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнай, дапаўняльнай часткамі, акалічнаснымі часткамі месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальнымі, параўнальнымі, спосабу дзеяння, меры і ступені. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

Простая і ўскосная мова як спосабы перадачы чужой мовы. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Правілы замены простай мовы на ўскосную.

Дыялог. Знакі прыпынку пры дыялогу.

Цытаты. Правілы афармлення цытат на пісьме.

Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы.

**Раздзел V. Маўленне**

Тэкст. Стылістыка

Паняцці «мова» і «маўленне». Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне, пісьмо.

Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту. Загаловак. Спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце.

Тыпы маўлення (апісанне, апавяданне, разважанне), іх кампазіцыйныя схемы.

Функцыянальныя стылі маўлення (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы), стылеўтваральныя моўныя сродкі.

Прыкметы стыляў маўлення: задачы, сфера прымянення, адметныя стылявыя рысы, моўныя сродкі.

Канспект. Анатацыя. Рэферат. Водгук. Змест, кампазіцыя, моўныя сродкі жанраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ